№ 43 (3886)

6 чэрвеня 2014 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...*

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Падпіска на "Народную Волю" на другое паўгоддзе блізіцца да завяршэння.
Не спазніцеся!
Вы — з "Народнай Воляй",
"Народная Воля" — з Вамі!

АКТУАЛІІ

Святлана КАЛІНКІНА

ГЛУХАТА

Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні ў сувязі са смерцю расійскага музыказнаўцы і тэлевядучага Станіслава Бэлзы. А вось спачуванняў у сувязі са смерцю знанага беларускага паэта, беларускага дыпламата, былога кіраўніка Беларускага тэлебачання Генадзя Бураўкіна не выказаў.

І ў сувязі са смерцю народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна не выказаў.

Хаця, на мой погляд, зрабіць гэта быў проста абавязаны.

І не таму, што родным нашых славутых паэтаў гэта так ужо патрэбна. Гэта патрэбна ўсім нам — тым, у каго пасля адыходу з жыцця вялікіх творцаў і вялікіх патрыётаў Бацькаўшчыны ўзнікла пачуццё пустэчы, адчуванне чужароднасці ў сваёй дзяржаве.

Я амаль упэўнена, што Лукашэнка не знаёмы з творчасцю Бэлзы, гэтаксама як і з творчасцю Барадуліна ці Бураўкіна. Аднак тым больш паказальна, што ён знайшоў час падпісаць спачуванне расійскаму дзеячу, што ўвогуле ўспомніў пра такога. А вось на адрас беларускіх мысляроў, людзей, адданых сваёй Радзіме, людзей, якія для пэўнай часткі нашага грамадства сталіся іконамі, добрых слоў не знайшоў.

Так, Барадулін і Бураўкін не падтрымлівалі палітыку Аляксандра Лукашэнкі. Душою, сэрцам, думкамі яны былі не з ім. А з тымі, хто бачыць Беларусь не гістарычнай недарэчнасцю, не савецкім, згубленым у часе анклавам, а вольнай еўрапейскай краінай.

Не было, няма і не будзе ў гэтым нічога антыдзяржаўнага ці антыбеларускага. Наадварот.

Так, яны не пісалі вершы накшталт "Товарищ президент". Але патрыёт — той, хто адданы сваёй краіне, свайму народу, а не канкрэтным асобам, якія часова аказаліся на высокіх пасадах. Служыць асобам — гэта звычайнае і прымітыўнае халуйства, тут патрэбны адзіны талент — гнуткасць спіны і адзіная "смеласць" — нахвальваць ды падтакваць. Вось толькі ўсё сведчыць аб тым, што менавіта халуі сённяшняй уладзе асабліва мілыя, а людзі сапраўднага таленту, глыбокага, філасофскага бачання свету — такія, як Барадулін і Бураўкін, — не...

Сваімі вершамі, словамі, учынкамі яны запальвалі агеньчыкі беларускасці ў мільёнах сэрцаў. А які агеньчык і ў чым сэрцы маглі запаліць «Товарищ президент» і таму падобная творчасць? Хіба толькі няёмкасць ды адчуванне чагосьці фальшывага, брыдкага, слізкага.

Аднак наверсе ўлады патрыятычным лічыцца такое:

Слушай Батьку!
Утром, ночью и днем...
Слушай Батьку!
Если плохо тебе...
Слушай Батьку!
Если все хорошо...
Слушай Батьку!

А вось так маліць Бога, як гэта зрабіў Генадзь Бураўкін, — аказваецца, няправільна і непатрыятычна.

Мы здалёку ўбачылі свабоду
І яшчэ не вырваліся з пут...
Божа,
Не дабаў майму народу
Пошасці,
Няпраўды
І пакут.
У чужым нялюдскім землятрусе
Хіба ў нечым мелі мы віну?..
Божа,
Адвядзі ад Беларусі
Здраду,
Вераломства
І вайну.
Смутнаю парою нелюдзімай,
Калі ўсё вакол ідзе на злом,
Божа,
Захіні маю Радзіму
Мудрасцю,
Спакоем
І цяплом.

Лукашэнка і Барадулін, Лукашэнка і Бураўкін размаўлялі ў прамым сэнсе слова на розных мовах. Кіраўнік Беларусі як сказаў некалі, што "*по-белорусски нельзя выразить ничего великого*", так да нядаўняга часу і стаяў на сваім. Як навучылі яго ў савецкія часы, што Расія прынесла цывілізацыю ў наш *"адсталы Паўночна-Заходні край"*, так ён і на прэзідэнцкай пасадзе застаўся з комплексам правінцыяла. А вось Барадулін і Бураўкін не сорам і не няёмкасць адчувалі за свой народ, яны адчувалі за яго гонар і нас усіх гэтаму вучылі.

Хаця б таму, што першая Канстытуцыя ў Еўропе (другая пасля ЗША) на беларускай мове напісана! А гэта, як ніштo іншае, сведчыць пра надзвычай высокае духоўнае, палітычнае, культурнае развіццё нашай дзяржавы Вялікага Княства Літоўскага ў тыя часы. Па крайняй меры значна вышэйшае, чым у тагачаснай Расіі. І калі б не маскоўскіх вайскоўцаў-пенсіянераў Лукашэнка з пашанай прымаў у сваіх рэзідэнцыях, калі б не з хакеістамі-бізнесменамі па дзяржаўных справах раіўся, калі б хоць раз сустрэўся з нашымі нацыянальнымі мыслярамі (ды сустрэўся, каб паслухаць, а не каб самому толькі вяшчаць), то і ён бы ведаў:

— чаму зацверджаны Пятром І расійскі шрыфт называўся "беларускай азбукай,

— што "расійскі" першадрукар Іван Фёдараў быў беларусам, а "высокакультурныя" расіяне яго і Пятра Мсціслаўца за гэтую "бесовскую" справу з Масквы выгналі,

— што «Граматыка» архіепіскапа Полацкага Мялеція Сматрыцкага доўгія гады была падручнікам, па якім тыя ж рускія вучыліся пісаць,

— што пачатак расійскаму вершаскладанню паклаў настаўнік царскіх дзяцей — наш Сімяон Полацкі,

— што за 250 гадоў да Канстанціна Цыялкоўскага шматступеньчатую ракету вынайшаў беларус Казімір Семяновіч...

І гэтак далей, і гэтак далей...

Іншымі словамі, што мы не з дзікіх плямёнаў, якія рускія павыцягвалі з балотаў ды навучылі чытаць-пісаць (тут яшчэ трэба разбірацца — хто каму культуру нёс). Што беларусы — годны народ, які мае і сваіх герояў, і сваю славу, і сваю гісторыю і які ні перад кім не павінен стаяць на каленях. Ні перад кім!

Менавіта гэта даказвалі, менавіта пра гэта пісалі, менавіта за гэта змагаліся і Рыгор Барадулін, і Генадзь Бураўкін, і іншыя нашы творцы. У выхаванні патрыятызму яны рабілі болей, чым усе штатныя ідэолагі разам з самім Лукашэнкам. Дык за што ў сваёй краіне іх фактычна трымалі за ворагаў — з забаронай на сустрэчы з чытачамі, забаронай друкавацца ў афіцыйных выдавецтвах, забаронай выступаць у дзяржаўных СМІ?..

Дык ці не заслужылі яны хаця б апошняе "Прабачце" ад чалавека, які не ўмеў і не хацеў слухаць іх, нашых сапраўдных прарокаў, сціплых, глыбокіх, мудрых?..

...Сплыве па Дняпры
Набрыдзь,
Навалач,
Хлюсь.
Майдан праз вякі
Прывітае быліна.
Не схіліць чало
Спадарыня Беларусь,
Незалежная, як жыццё,
Нэнька Украіна.

Гэта адзін з апошніх вершаў Рыгора Барадуліна. Ён ведаў, што адыходзіць, ён ужо мала што мог, яму ўжо усё балела, але не думаць пра Беларусь па-ранейшаму не мог, яна яму балела больш, чым якая хвароба.

Няўжо ад дзяржавы ім так і не будзе падзякі — Васілю Быкаву, Рыгору Барадуліну, Генадзю Бураўкіну?

Няўжо, нават гледзячы на прыклад Украіны, мы так і не ўбачым відавочнага: што не спецназ, не "Альфа", не армія і тым больш не прэзідэнт там бароняць дзяржаву. Што гэта робяць звычайныя людзі — тыя, каму запалі ў душу вершы на роднай мове, песні на роднай мове, бабуліны ды матуліны вышыванкі, казкі, паданні роднай зямлі — усё тое, што робіць тых, хто жыве ў краіне, не насельніцтвам, а народам.

Няўжо нават пасля гэтага наша дзяржава не аддасць даніну павагі лепшым сынам Беларусі, якія рабілі з нас беларусаў насуперак волі дзяржавы?

Няўжо нават цяпер Аляксандр Лукашэнка не зразумее розніцу паміж тымі, хто служыць пасадам, і тымі, хто служыць сваёй краіне?

Няўжо ён так і не знойдзе часу, каб прыйсці з бел-чырвона-белым букетам на магілу Бураўкіна ці з букетам валількоў на магілу Быкава? Няўжо так і не адважыцца сказаць гэтым мудрым і светлым людзям: "Прабачце..."

Няўжо ён іх так і не пачуе?.. Няўжо і мы не пачуем?.. Няўжо пачуем, ды будзе позна?..

УЧОРА

У Польшчы ўганаравалі Станіслава Шушкевіча

5 чэрвеня ён атрымаў тытул Doctor Honoris Causa самага прэстыжнага і заслужанага ўніверсітэта Польшчы SGH (Галоўнай школы гандлю).



Адкрыў урачыстасць рэктар універсітэта прафесар **Томаш Шапіра**. Таксама прагучалі віншаванні прэзідэнта Польшчы **Браніслава Камароўскага**, і экс-кіраўнікоў краіны **Леха Валенсы і Аляксандра Квасneўскага.**

На ўрачыстым мерапрыемстве прысутнічалі рэктары вядучых універсітэтаў Польшчы. Дарэчы, акрамя палітычнай дзейнасці, якая прывяла да палітычных і эканамічных змен у рэгіёне, прафесар Шушкевіч з'яўляецца аўтарам больш як 150 навуковых работ, 2 падручнікаў, 7 манаграфій. Ён сааўтар 73 вынаходніцтваў, навуковы кіраўнік 33 дысертацый па фізіка-матэматычных навуках.

Сімвалічна, што Станіслаў Шушкевіч, які паставіў подпіс у Віскулях і скончыў існаванне СССР, атрымаў тытул доктара Honoris Causa ў 25-ю гадавіну правядзення першых адносна свабодных выбараў у Польшчы.

Хто ўзначаліць ВАК?

***Анатоль Афанасьеў** вызвалены ад пасады старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі ў сувязі з выхадам у адстаўку*.

Кіраўніком ВАК Афанасьеў быў прызначаны 19 студзеня 2006 года. На гэтай пасадзе ён змяніў **Анатоля Рубінава**.

У кроку ад адстаўкі

Старшыня Гомельскага аблвыканкама ***Уладзімір Дворнік*** *«за патуранне, дапушчаныя недахопы і пралікі ў кадравай працы, непрыманне належных мер па выкананні заканадаўства аб дзяржаўнай службе і барацьбе з карупцыяй» папярэджаны аб няпоўнай службовай адпаведнасці.*

19 мая былі затрыманы першы намеснік старшыні аблвыканкама Віктар Банчук і намеснік старшыні Віктар Трызна. Яны абвінавачваюцца ў злоўжыванні ўладай і службовымі паўнамоцтвамі.

Банчук і Трызна былі прызначаны на свае пасады адначасова – 28 снежня 2012 года. Банчук раней узначальваў Рагачоўскі райвыканкам, Трызна працаваў на пасадзе кіраўніка спраў Гомельскага аблвыканкама.

У Расіі злавілі 8 падлеткаў з Беларусі

1 чэрвеня хлопцы збеглі з Крывіцкага спецпрафтэхвучылішча закрытага тыпу.

Чатырох хлопцаў злавілі каля чыгуначнай станцыі Рудня на Смаленшчыне, яшчэ траіх знайшлі ў Смаленску. А адзін з падлеткаў, Ігар Цылінскі з аграгарадка Друя на Браслаўшчыне, дабраўся аж да Люберцаў пад Масквой.

БЛІЦ

Як вядома, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі ***Анатоль Тозік*** *прапанаваў увесці ліміт бясплатных наведванняў паліклінік. "Трэба ўвесці поўную або частковую плату за неабгрунтаваны выклік "хуткай" або ўрача на дом, а таксама за наведванне паліклінікі, скажам, больш за восем разоў на год. Вядома, за выключэннем дзяцей, цяжарных жанчын і іншых катэгорый насельніцтва, для якіх гэта проста жыццёва неабходна", — адзначыў чыноўнік. Пры гэтым ён лічыць, што за так званы неабгрунтаваны выклік "хуткай" трэба браць ледзь не паўмільёна рублёў.*

"Народная Воля" пацікавілася:

Ці варта падтрымаць ініцыятыву Тозіка?

Міхаіл САДОЎСКІ, пенсіянер:

— Мне не зразумела, хто і як будзе вызначаць, абгрунтаваны быў выклік ці не. Натуральна, медыкам "хуткай" трэба падвышаць заробкі, але не такімі ж метадамі. А каму не трэба? Так і міліцыя скажа, што выклік нарада павінен быць платным. А за неабгрунтаваны — штраф. Напішуць, што сямейнага хулігана можна было пацярпець да раніцы: падумаеш, крычыць, спаць не дае, затое ж з сякерай ні за кім не бегае. Ды ці мала што можна прыдумаць! Там і пажарныя спахопяцца: маўляў, маглі б і самі патушыць вёдрамі... Спадзяюся, што ўсё застанецца на ўзроўні прапановы.

Святлана БУРКО, пенсіянерка:

— Гэта не толькі абуральна, гэта яшчэ і абсурдна. Я аднойчы выклікала "хуткую", бо было кепска. Мне сказалі, што высокі ціск, далі таблетку і зрабілі ўкол. А потым жанчына-ўрач разам з медсястрой пачалі мяне бэсціць. Казалі, што ў маім узросце трэба мець танометр і самой прымаць лекі ад ціску. А ў мяне раней такога не было ніколі. Дык цяпер атрымліваецца, калі табе за 50 і няма танометра, то і "хуткую" не выклікай, а то заплаціш за выклік усю пенсію?

Сяргей АНТОНЧЫК, дэпутат Вярхоўнага Савета 12-га склікання:

— Паміж чынавенствам, уладай і народам вялікая бездань. І яна павялічваецца штодня. Наменклатура, якая дарвалася да ўлады, вырашае для сябе нейкія пытанні, а народ корміць абяцаннямі. А заява Тозіка — гэта выклік усяму грамадству, і кожны, хто думае, павінен гэта зразумець... Ён выказаў прапанову і чакае — праглыне народ ці будуць нараканні? Папросту самі чыноўнікі ўжо даўно ніякай адказнасці не нясуць — ні за свае словы, ні за што іншае. Ніколі так не пагаршаліся ўмовы існавання народа ў Беларусі, як пры гэтай уладзе. Нават пры камуністах такога не было.

Любоў ЛУНЁВА.

ПАД КАЎПАКОМ

Да Мікалая Аўтуховіча па два разы на ноч прыходзіць міліцыя

Былы палітвязень, які зараз знаходзіцца пад прэвентыўным наглядам, займаецца здароўем, здае металалом і збіраецца паставіць каля хаты відэакамеру, каб ізноў не патрапіць у турму.



"Днямі я наведаў у Ваўкавыску Мікалая Аўтуховіча, — распавёў "Народнай Волі" праваабаронца **Алег ВОЛЧАК**. — *Зараз ён займаецца сваім здароўем і прыводзіць у парадак дамашнюю гаспадарку. Працы вельмі шмат, адпаведна і траты не маленькія. Днямі санстанцыя прыходзіла, заявіла, каб у бліжэйшы час Мікола добраўпарадкаваў тэрыторыю — пафарбаваў агароджу і гэтак далей. Інакш — буйны штраф. Пакуль Аўтуховіч не ўладкаваўся на працу, а таму вымушаны збіраць і здаваць металалом. Быў вельмі задаволены, што апошнім разам удалося здаць на паўтара мільёна рублёў. Дарэчы, калі хтосьці можа дапамагчы Мікалаю па гаспадарцы альбо жадае аказаць матэрыяльную дапамогу паштовым пераводам, то гэта наогул будзе проста цудоўна".*

Паводле слоў Волчака, завітала да Аўтуховіча і грамадская камісія, якая пацікавілася, чаму той не ўладкоўваецца на працу. Калі ж Мікалай распавёў, што пакуль прыводзіць у парадак здароўе, але міліцыя забараніла яму выехаць на лячэнне ў Мінск, члены камісіі абяцалі вырашыць пытанне.

"Мікола кажа, што пад прэвентыўным наглядам знаходзіцца не лягчэй, чым за кратамі, — дадае праваабаронца. — *Асабліва складана, калі міліцыя правярае па два разы на ноч. Да слова, Аўтуховіч, калі знойдзе спонсараў, то ўсталюе ля хаты відэакамеру, каб пасля не абвінавацілі, што быццам бы яго не было ў нейкі момант дома. Могуць жа па-новаму ў турму адправіць. Лепш перастрахавацца".*

Аляксандр НІКАНОРАЎ.

ПАЛІТКУХНЯ

Таемная дыпламатыя

Апошнія пару тыдняў былі надзвычай насычанымі ў рабоце беларускага Міністэрства замежных спраў.

28 мая 2014 г. у Міністэрстве замежных спраў Беларусі адбыўся першы раунд кансультацый па пытаннях мадэрнізацыі з удзелам намесніка міністра замежных спраў Алены Купчынай і дырэктара дэпартамента Расіі, «Усходняга партнёрства», Цэнтральнай Азіі, рэгіянальнага супрацоўніцтва і АБСЕ Еўрапейскай службы знешніх дзеянняў **Гунара Віганда.** У склад дэлегацыі ЕС увайшлі таксама дырэктар па пытаннях палітыкі суседства Генеральнага дырэктарата па развіцці і супрацоўніцтве Еўрапейскай камісіі **Міхаэль Кёлер,** кіраўнік Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі **Майра Мора**, эксперты дэпартаментаў Еўрапейскай камісіі па эканоміцы і фінансах, прадпрымальніцтве і прамысловасці, развіцці і супрацоўніцтве.

Асобна адбылася сустрэча міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея і Гунара Віганда...

30 мая 2014 г. Купчына сустрэлася з паслом па асобых даручэннях Міністэрства замежных спраў Латвіі **Юрысам Пойкансам.** Нагадаем, што менавіта да Латвіі зараз перайшло старшынства ў Еўрасаюзе і менавіта ў Рызе восенню гэтага года пройдзе саміт "Усходняга партнёрства" — мерапрыемства, на якое **Аляксандр Лукашэнка** яшчэ ніколі не атрымліваў запрашэння, хаця наша краіна ўдзельнічае ў гэтай еўрапейскай праграме.

2 чэрвеня 2014 г. адбылася сустрэча Алены Купчынай з начальнікам палітычнай секцыі (намеснікам міністра) Міністэрства па пытаннях Еўропы, інтэграцыі і замежных спраў Аўстрыі **Янам Кікертам.**

3 чэрвеня 2014 г. у Вене беларуская дэлегацыя на чале з намеснікам Міністра замежных спраў Беларусі **Аленай Купчынай** брала ўдзел у пасяджэнні Савета міністраў замежных спраў Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы (ЦЕІ). У гэтую арганізацыю ўваходзяць 18 краін-членаў: Аўстрыя, Албанія, Беларусь, Балгарыя, Боснія і Герцэгавіна, Венгрыя, Італія, Македонія, Малдова, Польшча, Румынія, Сербія, Славакія, Славенія, Украіна, Харватыя, Чарнагорыя, Чэхія.

3 чэрвеня міністр замежных спраў Беларусі **Уладзімір Макей** у Мінску прыняў намесніка памочніка Дзяржаўнага сакратара ЗША **Эрыка Рубіна**. Бакі не паведамляюць ніякіх падрабязнасцяў перамоў, але ў цэлым размова ішла аб нармалізацыі адносін.

Спіс сустрэч беларускіх і заходніх дыпламатаў, якія адбыліся на працягу апошняга часу, можна працягваць яшчэ доўга. І гэта сведчыць, што ў стасунках Беларусі і Захаду пачынаецца новая палітычная адліга. Як, дарэчы, перад амаль кожнымі прэзідэнцкімі выбарамі. Захад, насуперак таму, што сцвярджала беларуская прапаганда, ніколі не настойваў на адхіленні Аляксандра Лукашэнкі ад пасады. Захад патрабаваў, каб прэзідэнтам у нашай краіне быў той, хто сапраўды абраны народам, — іншымі словамі, каб былі рэальныя выбары. Афіцыйны Мінск заўсёды абяцаў, што так яно і будзе, але ні на адных выбарах не дазволіў сапраўднага грамадскага кантролю над падлікам галасоў. Па гэтым замкнёным коле ў стасунках з цывілізаваным светам мы ходзім ужо больш за дзесяць гадоў. Ці выйдзем з пасткі на гэты раз?

Паводле ўскоснай інфармацыі, Мінск зноў дае заходнім дыпламатам вялікія авансы. Па крайняй меры на восень ужо плануюцца візіты ў Мінск высокіх еўрапейскіх чыноўнікаў, а яны, як вядома, проста так да "дыктатараў" не ездзяць.

Звяртае на сябе ўвагу і тое, што ні намеснік дзяржсакратара ЗША Эрык Рубін, ні прадстаўнік Еўрапейскай службы знешніх дзеянняў (гэта, па сутнасці, МЗС Еўрасаюза) Гунар Віганд падчас сваіх візітаў у Мінск гэтым разам не сустракаліся з прадстаўнікамі беларускай апазіцыі. Хаця раней такія сустрэчы былі абавязковымі нават з меркаванняў паліткарэктнасці.

Адным словам, таемныя перамовы пачаліся... Праўда, скончыцца ўсё можа гэтаксама, як і ў 2010 годзе, калі літаральна за некалькі гадзін пасля прэзідэнцкіх выбараў надзеі на нармалізацыю адносін паміж Беларуссю і Захадам былі затаптаны ў акрываўлены снег цяжкімі ботамі спецназа.



Уладзімір Макей і Эрык Рубін.

ПАД ГРАДУСАМ

Дажджы спыняцца ў нядзелю

Такі прагноз надвор'я на выхадныя агучыў сіноптык Дзмітрый Рабаў.

— У суботу ноччу на большай частцы, а днём па ўсходняй палове чакаюцца кароткачасовыя дажджы, — *распавядае спецыяліст.* — Месцамі — моцныя, навальніцы, днём па ўсходзе магчымы град. Тэмпература ноччу +10...+16, максімальная днём +21...+28; па паўднёвым усходзе яшчэ на пару градусаў цяплей.

У нядзелю франтальны раздзел пакіне Беларусь, і ў многіх раёнах дажджы спыняцца. Тэмпература паветра мінімальная ноччу +8 па захадзе, да +17 па паўднёвым усходзе; максімальная днём +23...+28 градусаў.

ТЫМ ЧАСАМ

Прадстаўнікі беларускай апазіцыі пакуль схіляюцца да таго, што ў прэзідэнцкіх выбарах трэба ўдзельнічаць, абраўшы адзінага кандыдата. Зараз паміж лідарамі палітычных партый ідзе абмеркаванне працэдуры гэтага абрання. Большасць схіляецца да таго, каб быў праведзены Кангрэс дэмакратычных сіл, як гэта было ў 2006 годзе, калі адзіным стаў **Аляксандр Мілінкевіч.** Ужо зразумела, што "адзіны", калі і будзе абраны, то не раней за 2015 год.

Пакуль палітычныя лідары дамовіліся не абмяркоўваць у прэсе ні кандыдатуры, ні працэс перамоў і не даваць ніякіх публічных каментарыяў да прыняцця нейкага кансалідаванага рашэння.

Ігар МАРОЗАЎ.

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА



Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук

Украина — в Европу, Беларусь — в Евразию

Итак, в Астане 29 мая в торжественной обстановке был подписан договор о создании Евразийского экономического союза. Предусмотрено, что ЕАЭС начнет функционировать с 1 января 2015 года. Все сделано честь по чести. В договоре 28 разделов, 118 статей, 32 приложения — всего порядка 700 страниц. Написано, что договор направлен на решение задач по повышению благосостояния и качества жизни граждан Казахстана, России и Беларуси и предусматривает свободу движения товаров, услуг, капитала и рабочей силы, проведение скоординированной экономической политики. Нас, естественно, вновь ждут хорошие перспективы: интеграционный эффект в виде прироста совокупного (по трем странам) ВВП к 2030 году оценивается в размере около 900 млрд долларов...

Я сказал «вновь ждут», потому что, сколько себя помню, а это более 60 лет, наше общество жило и живет подобными перспективами. Перспективами построения коммунизма, кличем «каждой семье по отдельной квартире», зарплатой в 1000 долларов и т.д. — всем, что еще могли обещать людям не зависящие от них и неподконтрольные им несменяемые власти. Так, согласно договору, не пройдет и 10 лет — и к 2025 году все пошлины от экспорта нефтепродуктов уже будут оставаться в белорусском бюджете, и у нас, стало быть, будут «Эмираты», все три страны унифицируют цены на моторное топливо и т.п. Действительно, вдруг на белорусских прилавках появится дешевая казахская баранина?

Но вот беда — экономики стран-подписантов находятся далеко не в лучшей форме. Стагнируют с признаками рецессии. ВВП или не растет, или растет в пределах погрешностей местной официальной статистики. Максимум — в границах 1—2%. Тогда как мировая экономика дает 3—4% ежегодного прироста. По данным Белстата, ВВП Беларуси за январь—апрель вырос на 1,1%. Плюсовали в основном розничная и оптовая торговля. Промышленность дала минус 0,8%, сельское хозяйство — минус 0,2%. Параллельно едва различимому росту ВВП заметно продолжали расти складские запасы готовой продукции. С начала года — на 25,9%, достигнув очередного рекорда — на 35,2 трлн рублей залежей. Находясь в Таможенном союзе, белорусы получили российские пошлины на иномарки и неуемную инфляцию. Лукашенко накануне подписания договора прямо сказал, что этот союз — компромисс, что рассчитывали на другое: заиметь пошлины от экспорта нефтепродуктов в полном объеме с 1 января 2015 года, как и обещал Путин. Не получилось. Но если не подписать договор — может стать еще хуже. Ведь Путин сегодня может и «по-плохому».

Россия из-за российско-украинского кризиса несет большие траты — военного и хозяйственного характера. Российское правительство, можно сказать, не вылезает из Крыма. «И.о. главы» Крыма Аксенов и «глава «Госсовета» Константинов оказались никакими в качестве антикризисных менеджеров. Полуостров без воды, положение сельского хозяйства катастрофическое. Снабжение упало ниже некуда. Банковская система разрушена. Лекарства в аптеках на исходе. Безработица, инвесторы не идут, торговые сети уходят с рынка. Туристический курортный сезон проваливается.

К тому же российский истеблишмент ждал от недавнего визита Путина в Китай суперрезультатов, что и было анонсировано. Об огромных китайских инвестициях в российскую нефтехимию, о создании с китайцами платежной системы взамен американских Visa и Mastercard, о выгодных контрактах по сибирскому газу, о строительстве в Крыму порта и моста через Керченский пролив, о создании с участием Китая сверхскоростной железной дороги через Сибирь на Аляску, даже о договоренностях по совместным космическим исследованиям, вплоть до полета на Марс. Но результаты оказались более чем скромные. Эксперты даже ставят под сомнение рентабельность все же подписанного в последний момент с Китаем контракта об освоении новых месторождений и добыче сибирского газа с поставкой его в Поднебесную. Из 46 подписанных в Китае соглашений — почти все рамочные договоры и меморандумы о намерениях. Твердых контрактов практически нет.

Россия в настоящее время находится в мировой изоляции. Для российского руководства, которое уже ощутило результаты экономических санкций США и Евросоюза (так, по мнению главы Европейского центробанка Драги, за время российско-украинского кризиса из страны ушло капиталов на сумму 160 млрд евро), подписание договора ЕАЭС в противостоянии с Западом имеет больше политическое значение, нежели экономическое. Не отработан толком еще Таможенный союз, но график следующей интеграционной надстройки превыше всего. И Россия готова платить за это верным союзникам-сателлитам. Пользуясь случаем, Лукашенко выторговал-таки на 2015 год 1,5 млрд долларов от пошлин загрузку под завязку нефтью белорусских НПЗ, дающих живительную валюту, и скорый майский 2-миллиардный долларовый кредит. Который Путин через неделю так и не дал, до последней минуты, видно, опасаясь, чтоб неспокойный партнер, не дай Бог, передумает и не подпишет бумаги.

Оценивая средний уровень зарплаты в странах-подписантах, а это в Беларуси 560 долларов в эквиваленте, в России — около 1000 долларов и в Казахстане — свыше 750 долларов, можно уверенно сказать, что ЕАЭС — это союз бедных по мировым меркам стран. Союз неравных. Интеграция стран, в первую очередь это Россия и Казахстан, с сырьевыми экономиками. Экспорт Беларуси также основывается на первичной переработке сырьевых ресурсов (нефтепродукты и калийные удобрения). Доля инновационной продукции в ВВП России не превышает 4—5% (о Беларуси и говорить не приходится), тогда как удельный вес такой же продукции в ВВП США — 36%. Как известно, никогда союз бедных не делает их богатыми. Не сегодня-завтра к ЕАЭС примкнут такие «высокоразвитые» государства, как Армения и Киргизия. И, глядишь, забрезжит реинкарнация могучего СССР. Когда-то, скажем, Португалия была одной из беднейших европейских стран. После того как она вступила в Европейский Союз, ее экономика быстро подтянулась до среднеевропейского уровня. Сегодня ВВП Португалии в расчете на душу населения таков, что той же России, чтобы выйти на португальский уровень с ее темпами экономического развития, потребуется 30 лет. И то при условии, что португальская экономика будет стоять на месте. Успешно развивается экономика Польши, уровень жизни поляков в 1,5—2 раза выше, чем у белорусов. А стартовые условия у государств после развала СССР и соцлагеря были сопоставимыми.

Поэтому народ Украины решил свою судьбу по-другому. Проголосовал, пусть с кровью, за Европейский Союз. К этому Украину окончательно подтолкнул Путин, аннексировав Крым и вооружив затем своих боевиков для ведения боевых действий на украинском юго-востоке. Народ Украины сплотился и в один тур выбрал нового президента. Сегодня Украине тяжело. Идет гражданская война, развязанная пророссийскими сепаратистами. Чтобы претендовать на членство в ЕС, надо экономически и политически отвечать строгим европейским стандартам, на достижение которых стране потребуются годы. Но, как говорится, было бы желание. А у украинского народа оно есть.

Как показывает история, никогда и никакие государства-автократии, управляемые несменяемой десятилетиями властью одного человека, не достигали процветания. Будь они хоть трижды в каких хотите союзах. Автократы пекутся об экономике ровно настолько, сколько нужно, чтобы сохранить, удержать свою личную власть, консервировать ее бесконечно. Их командно-административные экономики никогда не будут эффективны, а союзы — прочны и реальны. Всегда союзников будет что-то не устраивать, противоречия между автократиями неизбежны. И они станут, как это было и ранее, спускать спорные моменты на тормозах, не выполнять свои обязательства.

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

Занкавец-малодшы пайшоў па бацькавых слядах

Беларускі хакейны трэнер Эдуард Занкавец вяртаецца ў омскі «Авангард», а яго 23-гадовы сын будзе трэніраваць мінскае «Дынама».



Можна сказаць дакладна — Омск цягне Эдуарда Занкаўца нібы магніт. У свой час ён выступаў за «Авангард» іграком, пасля працаваў там асістэнтам галоўнага трэнера Райма Суманена. Дарэчы, пад кіраўніцтвам гэтага трэнерскага штаба каманда ў сезоне 2011/2012 дайшла да фіналу Кубка Гагарына. І вось «Авангард» ізноў запрасіў да сябе і Суманена, і Занкаўца... Апошні, да слова, быў асістэнтам галоўнага трэнера зборнай Беларусі на апошнім чэмпіянаце свету, які праходзіў у Мінску.

— Запрашэнне ў «Авангард» не стала для мяне вялікай нечаканасцю, бо, калі сыходзіў з каманды, з усімі захаваліся добрыя адносіны, — распавёў **Эдуард ЗАНКАВЕЦ** «Народнай Волі». — Калі так развітваешся, то заўсёды існуе верагоднасць, што вернешся назад.

— А чаму кіраўніцтва омскага клуба зараз вяртае вас і Суманена?

— Менавіта пад кіраўніцтвам Суманена каманда паказвала высокія вынікі. Магчыма, палічылі, што ад дабра дабра не шукаюць. Так што на пачатку ліпеня ўжо з'язджаю ў Омск.

— Ваш 23-гадовы сын Уладзіслаў павесіў канькі на цвік і зараз стаў трэнерам па фізічнай падрыхтоўцы ў мінскім «Дынама». Ці не рана для трэнерства?

— Думаю, у самы раз. Чым раней пачне, тым больш будзе ведаць. Тым больш што падчас чэмпіянату свету сын працаваў у зборнай, так што нейкі багаж за спінай ужо мае. Інстытут закончыў, напісаў кнігу па фізпадрыхтоўцы... Няхай працуе — ён сам выбраў трэнерскую кар'еру.

Алесь СІВЫ.

ПРЕЗЕНТАЦИЯ

Вездеход за 48 тысяч долларов

Снегоболотоход BME-1915 разработки и производства белорусско-германского СП ЗАО «МАЗ-МАН» впервые публично представлен на 24-й Международной специализированной выставке «Белагро-2014».



Как сообщил БелаПАН специалист по продажам предприятия **Антон Жаврид,** это машина многоцелевого назначения, предназначенная для езды по любому бездорожью, способная преодолевать водные преграды.

«Машина разрабатывалась несколько лет, у нее было три прототипа, — сказал Жаврид. — *Выставленный экземпляр прошел сертификацию и готов к продаже».*

Кузов снегоболотохода сделан из стеклопластика, соединенного с металлическим корпусом. В качестве опции существует возможность установки гребного винта. Двигатель вездехода предлагается в двух комплектациях — бензиновый и дизельный. Ориентировочная стоимость снегоболотохода — 48 тысяч долларов.

Фото Василия СЕМАШКО.

ЗА РУЛЕМ!

Эксперт вам в помощь

Как быть, если после ДТП страховая компания, как вам кажется, занизила сумму выплаты на ремонт автомобиля? Куда следует обратиться, чтобы не переплатить за подержанный автомобиль, который вы решили купить?

Ответ вроде бы очевиден — к независимому эксперту. Но знаем ли мы, где искать такого специалиста? На дилерских центрах известных автокомпаний? На СТО?

Мой собеседник — Михаил СТЕЛЬМАХ, специалист по оценке транспортных средств.



— Официально такого понятия, как независимый автоэксперт, в Беларуси нет, — рассказывает Михаил. — Есть индивидуальные предприниматели либо сотрудники частных компаний, аттестованные в Белорусском бюро по транспортному страхованию, которые могут провести оценку транспортного средства, определить его стоимость, высчитать сумму, которая потребуется на ремонт автомобиля после ДТП и т.п. С июля таких специалистов будут называть оценщиками. Это предусмотрено указом президента, которым внесены поправки в ранее изданные указы по вопросам страховой деятельности и который вступает в силу в июле этого года.

— Независимых оценщиков в Беларуси много?

— Независимый — это значит не в штате страховой компании. Но сегодня практически все такие специалисты работают если не в штате, то по договору со страховыми компаниями, т.е. их заработок напрямую зависит от объема работ, который предоставит эта компания. В такой ситуации понятие «независимый» весьма сомнительно. Действительно, независимых оценщиков-экспертов — единицы. Мы как вымирающий вид.

— Почему? Ваши услуги не востребованы?

— Причин несколько. Первая и, пожалуй, главная — это финансовая. Насколько такой вид деятельности может приносить прибыль, давать возможность содержать себя и свою семью? Например, если страховая компания приглашает независимого специалиста для оценки ущерба, нанесенного автомобилю, после ДТП, она платит ему около 180 тысяч. А это огромный объем работы: машину надо осмотреть, сделать расчеты и подготовить полный пакет документов. Причем 180 тысяч специалист не получит: из этой суммы ему необходимо заплатить 70 тысяч только за пользование сертифицированным программным обеспечением, плюс налоги и накладные расходы.

Причем заключить договор со страховой компанией — проблема, работу дают выборочно, в основном приглашают на тяжелые случаи. И расценки на наши услуги тоже диктуют страховые компании.

— А обычные люди к вам обращаются за подобными услугами? Ведь сегодня нередко водители жалуются, что после ДТП страховая компания насчитывала меньше денег, чем требуется на ремонт...

— Такого механизма, когда потерпевший в ДТП сам мог бы выбрать оценщика, заплатить ему деньги, а потом эти расходы взыскать со страховой компании, нет. Автовладелец по своей инициативе может обратиться к независимому оценщику. Но это уже будет не оценка ущерба как таковая, а консультация. Естественно, за его счет.

Как сегодня проводится выплата по страховым случаям после ДТП? Пострадавший в пятидневный срок после ДТП должен обратиться в страховую компанию, где ему предложат услуги оценщика. Этот специалист, как правило, либо работник страховой компании, либо с ним страховая компания заключила договор на проведение таких работ. Например, на периферии зачастую сотрудник страховой компании сам принимает заявление о страховом случае, сам оценивает ущерб и сам подписывает документы о выплате. Заинтересованность уменьшить размер полагающегося возмещения вроде бы прослеживается. И зачастую первая реакция автовладельца, который категорически не согласен с назначенной ему суммой выплаты после ДТП: «Да я в суд пойду, но заставлю страховую компанию мне заплатить». Но не все так просто.

Во-первых, ни в какой суд он сразу идти не может. В правилах по определению размера вреда по случаям обязательного страхования оговорена процедура разрешения спорных ситуаций. Сначала автовладелец может потребовать дополнительный осмотр, и, если все равно будет недоволен начисленной выплатой, он должен написать заявления и проинициировать комиссионный осмотр. Тогда создается комиссия, на которую он может пригласить и независимого эксперта. Но, внимание: затраты на проведение комиссионного осмотра придется оплатить инициатору, и суммы могут доходить до нескольких миллионов рублей. По результатам этого разбирательства принимается решение. Надо понимать, что в состав этой комиссии приглашаются оценщики, которые, как правило, друг друга знают. Слишком узок круг этих специалистов в Беларуси. Их сегодня в стране аттестовано чуть более 100, но из них работает не больше половины.

— Это намек на то, что клиенту нереально взыскать со страховой компании большую сумму выплаты?

— Очевидных ошибок при осмотре машины и последующих расчетах оценщики не допускают. Если ошибки есть, их найдут в страховой компании перед выплатой и исправят. Могу сказать по своему опыту: из всех клиентов, которые консультировались у меня по поводу того, можно ли оспаривать со страховой компанией размер возмещения вреда, осмотр с комиссией не рекомендовал никому.

— Но если нет ошибок, как тогда добиться адекватной выплаты? И в чем суть вашей работы как консультанта?

— Дело в том, что любой оценщик работает по заявительному принципу. В его задачу не входит дефектовка автомобиля, т.е. определение и поиск невидимых повреждений после ДТП. Его задача определить ремонтное воздействие к тем деталям, которые ему показывают. Например, в ДТП пострадал бампер. А то, что под бампером какая-то деталь требует замены — он не учитывает. Если водитель немножко разбирается в автомеханике, он может потребовать дополнительный осмотр, чтобы при оценке вреда были учтены все поврежденные во время ДТП детали. А если нет, то специалист оценит только видимые повреждения и не всегда обратит внимание автолюбителя на возможные скрытые дефекты. И по сути он ничего не нарушит.

В этом и заключается основной смысл моей работы как консультанта — указать владельцу автомобиля на скрытые повреждения после ДТП, за которые он вправе требовать возмещения от страховой компании. При необходимости по доверенности я могу представлять интересы клиента в страховой компании. 95% клиентов, которые обратились ко мне в этом году, были не согласны с размером выплаты, насчитанной страховой компанией после ДТП. Они как бы понимали, что им предлагают сумму, за которую машину не отремонтируешь, но как это доказать и что можно сделать — не знали. Недавно, например, я помог клиенту добиться от страховой компании увеличить выплату на сумму более 20 миллионов именно потому, что не была проведена тщательная дефектовка автомобиля. Хочу заметить, что допосмотр с моим участием был четвертым по счету.

— А часто клиенты судятся со страховыми компаниями?

— Думаю, что нет. Например, Белгосстрах за 10 лет ни одного иска по автострахованию не проиграл. В судах чаще слушаются дела по так называемым нестраховым случаям (у виновника ДТП не было страховки, любовница поцарапала машину каблуками и должна возместить ущерб) или случаям, когда были нарушены правила страхования (виновник ДТП был за рулем пьяный и т.д.). По закону, при таких ДТП страховая компания сначала выплачивает сумму ущерба потерпевшему в аварии, а потом взыскивает ее с виновника. А они нередко считают, что эти суммы завышены, и идут в суд.

— Михаил, на ваш взгляд, институт независимой автоэкспертизы будет развиваться в Беларуси?

— Сегодня тенденция такая: страховые компании всю работу по оценке ущерба после ДТП стараются замкнуть на себе, в штате каждой страховой компании есть свои оценщики. И эти отделы разрастаются: машин становится все больше, ДТП случаются все чаще. Платить оценщику оклад и держать его в штате, конечно, выгоднее. Но только с этого года таких специалистов, как и независимых оценщиков, стали аттестовать в Белорусском бюро по транспортному страхованию, раньше достаточно было числиться в штате страховой компании и пройти недельные курсы. И я знаю некоторые компании, в которых оценкой занимаются люди без технического образования.

В такой ситуации выжить независимой экспертизе все сложнее. Я считаю, эта тенденция неправильная, потому что понятие «независимый оценщик» утрачивает свою актуальность, а это высококвалифицированные и опытные специалисты. В качестве доказательства могу привести свой пример. 5 лет назад мои коллеги засмеяли бы меня, узнав, что я решил стать независимым оценщиком. А сегодня это работает, услуга востребована.

— А как найти независимого оценщика, работающего с вопросами страхования? В Беларуси есть организации, которые предлагают услуги таких специалистов?

— Есть, но их очень мало. Пока эффективнее работает сарафанное радио. Я, например, в этой сфере с 2007 года. До 2012 года работал только как специалист по оценке вреда после ДТП, оценил порядка 10 тысяч автомобилей. В 2012-м стал подробно осваивать оценку транспорта и оборудования для целей, не связанных со страхованием (таможни, переоценка основных средств и т.д.). Те, кто меня знает, советуют мои услуги своим знакомым... При необходимости можно найти оценщика и в интернете.

— А сколько стоят ваши услуги?

— Все зависит от объема работ, которые придется выполнять. Я всегда говорю клиентам, что прежде всего дарю им спокойствие, уверенность в том, что в страховой компании их не обманут, они получат реальную выплату вреда, будут знать и понимать всю процедуру процесса оценки ущерба.

Мария ЭЙСМОНТ.

УВАГА!

Расшукваецца забойца дзіцяці

Заплечнік з трупам немаўляці вылавілі ў рацэ Свіслач.

Як паведамляе прэс-служба ГУУС Мінгарвыканкама, труп немаўляці знойдзены яшчэ 22 мая ў Свіслачы ля берага ў парку імя Янкі Купалы, аднак да цяперашняга моманту абставіны здарэння і асобы, якія маюць да яго дачыненне, не ўстаноўлены.

Вядома, што труп знаходзіўся ў заплечніку чорнага колеру з квадратнай нашыўкай з выявай рок-музыкантаў і надпісам «Velcom 3G Quest Pistols». Такія заплечнікі былі выпушчаны абмежаванай партыяй і распаўсюджваліся на канцэртах гэтай групы, якая выступала ў 2011 годзе ў Магілёве, Пінску, Баранавічах і ў 2012 годзе — у Брэсце, Пінску, Магілёве і Баранавічах.

Упраўленне крымінальнага вышуку ГУУС Мінгарвыканкама звяртаецца па дапамогу да грамадзян. Тых, каму можа быць нешта вядома пра абставіны смерці дзіцяці, альбо пра жанчын, якія не маюць дзяцей пасля перыяду цяжарнасці, альбо аб асобах, у карыстанні якіх меўся заплечнік, падобны на апісаны, просяць паведаміць аб гэтым па тэлефонах: 8(017) 200—60-36, 8(017) 288-81-13, 8(029) 356-02-02, 8(029) 381-04-19. Канфідэнцыяльнасць і ўзнагароджанне за значную інфармацыю гарантуюцца.

БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫ!

Справы сардэчныя

Каля 13,2% мінчан пакутуюць на хранічную сардэчную недастатковасць. Такія лічбы прывёў галоўны пазаштатны кардыёлаг Міністэрства аховы здароўя, дырэктар РНПЦ «Кардыялогія» ***Аляксандр Мрочак****.*

«Рэальных лічбаў аб распаўсюджанасці сардэчнай недастатковасці ў Беларусі мы не ведаем, — цытуе belta.by доктара. — *На падставе даследаванняў лабараторыі хранічнай сардэчнай недастатковасці РНПЦ «Кардыялогія» стала ясна, што толькі ў Мінску на гэтую хваробу пакутуюць каля 13,2% людзей. Гэта досыць вялікая лічба. Найбольш распаўсюджана захворванне ва ўзроставай групе ад 60 да 74 гадоў».*

Дарэчы, паводле слоў Мрочака, у Беларусі хранічную сардэчную недастатковасць лечаць на любой яе стадыі.

ТОЧКА ЗРЕНИЯ

Не решайте за крестьянина

